Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# БУДЗЕМ ДРУЖНА МЫ ГУЛЯЦЬ

(гульня – забава)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг.Грыцкевичы, 2022

Мэта: садзейнічаць развіццю сяброўскіх узаемаадносін паміж дзецьмі, згуртаванню калектыву.

Задачы: фарміраваць у дзяцей маральныя якасці: уменне сябраваць, шанаваць сяброўства, навыкі зносін адзін з адным; развіваць навыкі пазітыўна сацыяльных паводзін; выхоўваць сяброўскія адносіны і пачуццё таварыства.

Ход гульні:

З'яўляецца выхавальнік з паветранымі шарамі.

Выхавальнік: Добры дзень, дзеці. Прапаную вам вясёлае свята з гульнямі, танцамі. У мяне ёсць для гэтага рознакаляровыя шары і…(азіраецца). Ой, я забылася свой кошык для цацак дома. Я хуценька яго прынясу (выхавальнік выходзіць. Гучыць музыка, з'яўляецца Баба Яга).

Баба яга: Добры дзень, дзеткі, дзяўчынкі і хлопчыкі. Я, Бабулечка-Ягулечка, люблю павесяліцца. Што сумуем? Прапаную пагуляць. Гульня простая «Заплюшчы вочы - расплюшчы вочы». Давайце пагуляем: па маёй камандзе вочы ўсе закрываем і не адкрываем, пакуль я не скажу. (Баба Яга ўцякае, прыхапіўшы паветраныя шары, тым часам вяртаецца выхавальнік з кошыкам).

Выхавальнік: Што здарылася, дзеці? Чаму вы вочы закрылі? Дзе шары? (Адказы дзяцей).

Выхавальнік: Я скажу вам па сакрэце, што павесяліцца мы можам і без шароў. Галоўнае - гэта наш настрой. Прапаную пагуляць у гульню.

Рухавая гульня «Пасткі»

Выхавальнік: Прапаную пагуляць так: у маім кошыку ёсць рознакаляровыя стужачкі – гэта будуць хвосцікі. Прымацуйце стужку ззаду, заправіўшы частку стужкі ў шорты ці спадніцу. Падзелімся на пары і станем тварам адзін да аднаго.

Правіла гульні: пакуль гучыць музыка неабходна адабраць хвосцік у партнёра, але пры гэтым захаваць свой хвосцік.

Выхавальнік: Дружна весела гулялі. Спадабалася вам гульня? Якім трэба быць, каб перамагчы? (адказы дзяцей). Прапаную адпачыць і наведаць цуда - цырк.Ператвараемся ў паветраных гімнастаў. Гэта ў нас канат, па якім трэба прайсці, утрымліваць раўнавагу, каб не ўпасці. Гімнасты, будзьце ўважлівыя і асцярожныя!

Дзеці выконваюць практыкаванне.

Імітацыйнае практыкаванне "Гімнасты"

Выхавальнік: Малайцы! З вас атрымаліся спрытныя і смелыя гімнасты.

Пасля гульні з'яўляецца Баба Яга.

Б.Я: Апч-хі! Напылілі тут! Шары забрала, а вам усё весела.

Выхавальнік: Рады мы, што ты прыйшла. Як, Ягусенька, справы?

Б.Я: Што справы? Дрэнна!

Выхавальнік: А што здарылася?

Б.Я: Навошта вы мню, дзяцей палохаеце? Вы ж мяне зусім не ведаеце. А я добрая, і я прыгожая. Але толькі вельмі, вельмі нешчаслівая. Мне надакучыла мая хатка. Як я стамілася быць шкоднай бабулькай!

Выхавальнік: Навошта ты тады шары ў дзяцей забрала?

Б.Я: Мяне ніхто на святы не запрашае, ніхто са мною не гуляе.

Выхавальнік: Што ж рабіць, дзеці? (адказы дзяцей). Давайце запросім Бабу Ягу на наша свята і пагуляем з ёй.

Выхавальнік: Ты, Ягуся не лянуйся, разам з намі весяліся.

Б.Я: Мяне не забыліся! Мяне запрасілі! Пагуляю з дзеткамі дзяўчынкамі і хлапчукамі!

Гульня «Знайдзі прадмет»

Мэта гульні - вывучэнне або паўтарэнне літар, узбагачэнне слоўнікавага запасу, развіццё ўмення дзейнічаць хутка па заданні.

Заданне - за пэўны час знайсці ў групе або на ці на ўчастку прадметы, назвы якіх пачынаюцца на тую літару, якую назаве вядучы. Усе павінны прынесці, або падысці да яго і паказаць яго вядучаму, назваўшы гэты прадмет.

Гульня «Што бярэш з сабой?»

Дзеці становяцца ў кола. Вядучы кажа кожнаму гульцу, куды ён ідзе. Гулец павінен сказаць, які прадмет ён возьме. Прадмет павінен пачынацца на тую ж літару, што і месца, куды ідзе гуляючы. Напрыклад:

- Ты ідзеш у цырк і бярэш з сабой…
- Цукерку.
- Ты ідзеш у тэатр і бярэш з сабой…
- Торт.

Той, хто не можа назваць слова на адпаведную літару, выходзіць з гульні.

Другі варыянт. Гульцы кідаюць адзін аднаму мяч, кажучы, куды трэба пайсці. Той, каму кінулі мяч, ловіць яго і гаворыць, што бярэ з сабой. Затым ён перакідвае мяч наступнаму гульцу.

Напрыклад:

- Ты ідзеш у школу і бярэш з сабой…
- Шакаладку.
- Ты ідзеш у садок і бярэш з сабой…
- Сумку.

Баба Яга: Гэта вось іншая справа. На сто гадоў памаладзела. Дагадзілі, да чаго ж вы добрыя!

Выхавальнік: Дзякуй, Ягуська! Дзеці, вам спадабалася гуляць? Давайце развітаемся з Бабуляю Ягою, да пабачэння, да новых сустрэч!